ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 25 (158) | Субота, 8 верасня 1973 г. | Год выдання 5-ты | Цана 2 кап.

СЛОВА ДА ПЕРШАКУРСНІКА

## НА СЛАЎНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

Сёлета ў пяты раз гасцінна расчыніліся дзверы нашага ўніверсітэта перад першакурснікамі. 875 юнакоў і дзяўчат улілося ў студэнцкую сям'ю. Яны будуць набываць не толькі адукацыю, але і працягваць добрыя традыцыі, якія ўласцівы для нашай камсамольскай арганізацыі. Яе гісторыя пачынаецца з 1930 года, калі ў Гомелі быў адкрыты аграпедагагічны інстытут. Тысячы спецыялістаў падрыхтавана ў вядучай вышэйшай навучальнай установе беларускага Палесся. Многія з іх сталі віднымі партыйнымі і савецкімі работнікамі, заслужанымі настаўнікамі.

Больш ста выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта самаадданa абаранялі нашу Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аб гераічных подзвігах савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны вам могуць расказаць выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму І. А. Ільіных, Я. А. Семянчук, Я. Р. Ермалаеў, начальнік курса грамадзянскай абароны Р. С. Мільчанка, загадчык кафедры філасофіі У. С. Сідараў, старшыня камітэта ДТСААФ П. У. Жукаў і многія іншыя.

Наша камсамольская арганізацыя мае і слаўныя працоўныя традыцыі. Упершыню наш будаўнічы атрад у саставе 106 чалавек выязджаў на новабудоўлі Заходняга Казахстана дзесяць гадоў таму назад. Узначальваў яго старшы выкладчык М. У. Акуліч. А летась у трэцім, працоўным семестры ўжо ўдзельнічала 585 студэнтаў ГДУ. Яны асвоілі 828 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Яшчэ больш значны ўклад нашых студэнтаў у паспяховае выкананне заданняў пяцігодкі ў сёлетнім працоўным семестры. 24 атрады плённа працавалі на важнейшых аб'ектах Гомельшчыны, 2— у братняй Малдавіі, 15 студэнтаў універсітэта выязджала на новабудоўлі Чэхаславакіі. Каб пераканацца ў стараннасці нашых студэнтаў, дастаткова назваць адну лічбу. Толькі атрад «Амфібія» (камандзір —Уладзімір Касабукін, камісар — Міхаіл Саўчанка) на меліярацыйных аб'ектах выканаў работ на 143 тысячы рублёў.

Студэнцкія будаўнічыя атрады праводзілі таксама вялікую грамадска-палітычную работу. На рахунку іх байцоў звыш ста прачытаных лекцый і паказаных канцэртаў. На месцах дыслакацыі СБА былі адкрыты «Бюро добрых паслуг» для мясцовага насельніцтва, кансультацыйныя пункты для старшакласнікаў, піянерскія лагеры.

За ўдзел у студэнцкім будаўнічым руху камсамольская арганізацыя ўніверсітэта ўзнагароджана граматамі ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМБ, Ганаровай граматай Міністэрства сельскагаспадарчага будаўніцтва. 25 камсамольцаў удастоены медаляў «За асваенне цалінных зямель». Трое лепшых студэнтаў былі ўзнагароджаны Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, а многія — граматамі ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ.

Усе мы сёлета ўдзельнічалі ва Ўсесаюзным фестывалі савецкай моладзі. Яго вынікі падводзіліся да Дня савецкай моладзі. У ходзе фестывалю зарадзілася шмат цікавых форм камсамольскай работы.

Актыўна ўдзельнічаюць члены ВЛКСМ у Ленінскім заліку, які праходзіць пад дэвізам: «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!» і прысвячаецца 50-годдзю з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Гэты залік — своеасаблівы рапарт Камуністычнай партыі, савецкаму народу аб камсамольскіх справах. У ходзе заліку дэманструюцца вернасць моладзі запаветам Ільіча, адданасць справе партыі і народа. Абавязак кожнага камсамольца — паспяхова здаць гэты залік.

Нашых студэнтаў аб'ядноўвае моцная дружба з піянерамі горада. Значную дапамогу яны аказваюць і сельскай школе.

З удзячнасцю гавораць жыхары Гомеля і вобласці пра самадзейных артыстаў універсітэта. Асабліва вялікай папулярнасцю карыстаецца вакальна-інструментальны ансамбль «Радзімічы», які зараз знаходзіцца на гастролях у Малдавіі. Добрую рэпутацыю заваяваў і наш танцавальны калектыў. З поспехам выступае таксама тэатр мініяцюр. Калектывы мастацкай самадзейнасці ёсць на кожным факультэце. Лепшы з іх — на мехмаце, які бывае частым госцем у сельскіх гледачоў.

Перад табой, таварыш першакурснік, пяць студэнцкіх гадоў. Яны павінны стаць лепшымі гадамі тваёй маладосці, запамятацца на ўсё жыццё. Але ведай, што іх трэба правесці з максімальнай карысцю. Не ў якім разе нельга, каб яны сталі гадамі лёгкага, бесклапотнага часаправаджэння «ад сесіі да сесіі». Цябе чакае шмат спраў, добрых і цікавых, камсамольская работа. Разам з асноўнай ты можаш набыць ва ўніверсітэце і любую грамадскую прафесію.

Дык трымай, першакурснік, высока марку савецкага студэнта!

**Я. ЛЯЛЬКОВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола.**



## УНІВЕРСІТЭЦКІЯ НОВАБУДОЎЛІ



**З кожным годам пашырае свае межы наш універсітэт. Павялічваецца колькасць студэнтаў, адкрываюцца новыя кафедры.**

**Ужо нямнога засталося чакаць да таго дня, калі будзе здадзены ў эксплуатацыю новы будынак галоўнага корпуса (на верхнім здымку). З уводам яго ў дзеянне значна палепшацца ўмовы для ўсяго вучэбнага працэсу ва ўніверсітэце.**

**Выхаванцаў ГДУ чакае і яшчэ адзін добры падарунак. Поўным ходам вядуцца работы на будаўніцтве інтэрната кватэрнага тыпу (здымак справа). Пасля яго засялення будзе ў асноўным вырашана жыллёвая праблема студэнтаў.**

Фота **А. Рудчанкі.**

## СЕМІНАР САКРАТАРОЎ

5 верасня партком правёў семінар сакратароў пярвічных партыйных арганізацый універсітэта. Абмеркаваны пытанні аб падрыхтоўцы і правядзенні справаздачна-выбарчай кампаніі ў партарганізацыях, камплектаванні сістэмы партыйнай вучобы, аб партыйным кіраўніцтве камсамолам. На семінары таксама ішла размова аб праўдзенні падпіскі на перыядычныя выданні 1974 года і аб выніках трэцяга працоўнага семестра студэнтаў, адбыўся абмен думкамі па актуальных пытаннях партыйнага жыцця.

## УСТАНОВАЧНАЯ СЕСІЯ

Сёлета на завочнае аддзяленне нашага ўніверсітэта прынята 550 абітурыентаў, якія найбольш паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены. Пазаўчора для першакурснікаў-завочнікаў пачаўся навучальны год. На агульным сходзе, які адбыўся ў актавай зале, іх цёпла віталі з паступленнем у вядучую вышэйшую навучальную ўстанову беларускага Палесся, жадалі плённай вучобы.

Сход адкрыў рэктар універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук Б. В. Бокуць. Ён прадаставіў слова прарэктару па завочнаму аддзяленню дацэнту Т. П. Трацэўскай, якая расказала аб задачах студэнтаў ГДУ ў новым навучальным годзе.

Для першакурскнікаў-завочнікаў былі прачытаны дзве лекцыі: дацэнтам кафедры філасофіі Л. І. Нядзеля «Аб культуры і культурнасці чалавека» і старшым выкладчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі В. І. Філічавай «Аб арганізацыі самастойнай работы студэнта-завочніка».

Прысутныя на сходзе пазнаёміліся з прафесарска-выкладчыцкім саставам.

## НА ДАПАМОГУ ПРАЦАЎНІКАМ ВЁСКІ



**Сёлетні год радуе хлебаробаў багатым ураджаем. На палях калгасаў і саўгасаў добра ўрадзіла і бульба, якую называюць другім беларускім хлебам. У гаспадарках паўсюдна вядзецца яе ўборка. Як і ў папярэднія гады, вялікую дапамогу працаўнікам вёскі акажуць студэнты нашага ўніверсітэта. У мінулы панядзелак больш двюх тысяч чалавек выехала ў многія раёны вобласці. На ўборцы бульбы яны будуць працаваць да канца верасня.**

**Хочацца верыць, што нашы студэнты пастаяць за гонар свайго ўніверсітэта, пастараюцца так, каб за іх работу толькі дзякавалі.**

**НА ЗДЫМКАХ: 1. Зборы былі нядоўгімі. 2. У гэтых дзяўчат цудоўны настрой.**



# ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ



Урачыстае пасвячэнне ў студэнты пачалося вынасам сцягаў універсітэта.

ФОТАРЭПАРТАЖ



Запальванне «чашы ведаў».

У ГОМЕЛЬСКІМ дзяржаўным універсітэце стала добрай традыцыяй праводзіць 1 верасня ўрачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты.

З самага ранку каля галоўнага корпуса ўніверсітэта сабраліся сотні радасных юнакоў і дзяўчат. Гучыць мелодыя песні «Широка страна моя родная». У калоны па факультэтах выстройваюцца тыя, хто зусім нядаўна паспяхова вытрымаў уступныя экзамены і цяпер зойме месца ў аўдыторыях і лабараторыях вядучай вышэйшай навучальнай установы беларускага Палесся.

На ўрачыстасць прыбылі сакратар абкома КПБ А. І. Жыльскі, другі сакратар гаркома КПБ Б. М. Тамашоў, першы сакратар Чыгуначнага райкома партыі Т. В. Сафронава, першы сакратар гаркома ЛКСМБ Аляксей Касцючэнка.

Прафесар, доктар сельскагаспадарчых навук, кавалер ордэна Леніна Ф. М. Харытановіч, студэнт другога курса механіка-матэматычнага факультэта, камандзір будаўнічага атрада, камуніст Р. Дуб, заслужаны майстар спорту, алімпійскі чэмпіён Л. Гейштар выносяць сцягі ўніверсітэта.

Слова даецца сакратару абкома КПБ А. І. Жыльскаму. Ён горача віншуе першакурснікаў з уступленнем у студэнцкую сям'ю, жадае ім вялікіх поспехаў, гаворыць аб тых задачах, якія стаяць перад вышэйшай школай па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Да першакурснікаў звяртаецца прарэктар па навуковай рабоце ўніверсітэта прафесар М. В. Навучыцель.

Аб'яўляецца, што ад Вечнага агню, які гарыць ля брацкай магілы на плошчы Працы, спартсмены ГДУ нясуць факел. На апошнім этапе з ім бяжыць чэмпіён Беларусі, член зборнай каманды краіны па лёгкай атлетыцы, студэнт трэцяга курса факультэта фізвыхавання Уладзімір Якутовіч. Пад пошчак барабана і дружныя апладысменты прысутных ён запальвае сімвалічную «чашу ведаў».

Прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт Д. А. Лявончанка ўручае сімвалічны студэнцкі білет першакурснікам Людміле Жукавай з эканамічнага і Аляксандру Казлову з гісторыка-філалагічнага факультэтаў.

Першакурснік механіка-матэматычнага факультэта Аляксандр Новікаў зачытвае клятву студэнтаў. Над калонамі дружна пранеслася: «Клянёмся!»...

Выпускнік механіка-матэматычнага факультэта, Ленінскі стыпендыят, удзельнік X Сусветнага фестывалю студэнтаў і моладзі ў Берліне Уладзімір Семянчук уручае першакурснікам сімвалічны ключ ад краіны ведаў.

Зачытваецца тэлеграма ад першага рэктара Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР У. А. Белага.

Ад камсамольскай арганізацыі горада першакурснікаў віншаваў з уступленнем у студэнцкую сям'ю першы сакратар ГК ЛКСМБ Аляксей Касцючэнка.

Звініць першы званок новага навучальнага года.

У добры шлях, першакурснікі!

Б. ВАЛОДЗІН.



По добрай традыцыі лепшыя студэнты ўніверсітэта ўсклалі кветкі да помніка воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.






Вялікі гонар трымаць у руках гэты сімвалічны студэнцкі білет.

Ключ у краіну ведаў уручан першакурсніцы эканамічнага факультэта Алені Дзіўновай.

Фота А. Рудчанкі.

ВЕСТКІ З ПРАКТЫКІ

# СВЕДКІ ДАЛЁКАЙ СТАРЫНЫ

В ОСЕННЮ мінулага і летам сёлетняга года пад кіраўніцтвам аўтара гэтых радкоў былі раскапаны тры курганы каля вёскі Курганне Жлобінскага раёна. Раскопкі праводзіліся пры актыўным удзеле вучняў Казіміраўскай васьмігадовай школы і яе дырэктара Ю. Г. Ішу, які вельмі цікавіцца гісторыяй, археалогіяй, краязнаўствам.

«Курган» — слова цюркскае. Так называюць насып над старажытнай магілай. Гэты насып звычайна зроблен з зямлі, а падчас з каменняў. Першыя курганы пачалі ўзнікаць яшчэ ў трэцім тысячагоддзі да нашай эры.

У першым кургане, які мы раскапалі, было выяўлена двайное пахаванне — дарэчы, такія пахаванні сустракаюцца не так ужо і часта. Зыходзячы з параўнання памераў касцякоў і характару ўпрыгожванняў, можна зрабіць вывад: тут былі пахаваны мужчына і жанчына. Але чаму яны апынуліся ў магіле разам?

Безумоўна, не выключана магчымасць, што пахаваныя памерлі або загінулі адначасова, але верагодна і тое, што жанчына была забіта, каб стаць спадарожніцай свайго гаспадара на той свет. Такі звычай існаваў у славян. Ёсць і трэцяе тлумачэнне: жанчына памерла пазней; пазней яе і закапалі, патрывожыўшы для гэтай мэты курган...

Апрача шкілетаў, у першым кургане былі старажытныя рэчы з бронзы, жалеза і гліны. Апынуліся яны тут таму, што ў даўніну існаваў звычай класці з нябожчыкам рэчы, якія той любіў пры жыцці і якія — як верылі яго родзічы — змогуць спатрэбіцца яму на тым свеце.

У мужчынскім пахаванні каля левага локця ляжалі бронзавыя крыж-складзень (энкалпіён), паясное кальцо, бляшка ад пояса і спражка, а таксама баранкападобнае жалезнае крэсіва і нявызначаная жалезная рэч; каля правага калена — паяснное кальцо з жалеза, каля ног з правага боку — раструшчаны гліняны гаршок, тыповы для XII стагоддзя. У жанчыны на пальцы левай рукі быў надзет бронзавы пярсцёнак, а ля грудной клеткі і пояса з левага боку ляжала прыгожая бронзавая падвеска, падобная на лічбу «8», з двума конскімі галоўкамі, жалезнае паясное кальцо і баранкавападобнае крэсіва.

Другі курган быў значна беднейшым. У ім выяўлена адзіночнае пахаванне. Ніякіх рэчаў не знойдзена, апрача разбітага гаршка XII стагоддзя. Нічога дзіўнага: не так ужо і рэдка сустракаюцца курганы, у якіх наогул няма ніякіх рэчаў; бываюць нават такія, у якіх няма нават пахаванняў.

Трэці курган быў не зусім звычайным. Ён адрозніваўся ад многіх сваіх суседзяў. Папершае, памерамі: вышыня яго складала 2,25 метра; дыяметр дасягаў 16 метраў. Прыкладна такія памеры яшчэ толькі ў 9 курганоў, а ўся курганная група да моманту раскопак налічвала 61 насып. Падругое, формай: ён меў выгляд усечанага конуса, у той час, калі амаль усе іншыя насыпы нагадвалі больш-менш правільныя паўшар'і. А вось пахаваны інвентар у гэтым кургане склаўся ўсяго з гаршка і арабскай манеты.

Васьмёркападобная падвеска з конскімі галоўкамі выдзяляецца сваёй арыгінальнасцю сярод шырока вядомых падвесак у выглядзе розных жывёлін, манет, маленькіх крыжыкаў, званочкаў. Гэтыя металічныя вырабы былі любімым жаночым упрыгожваннем.

Вельмі цікавай знаходкай з'яўляецца і энкалпіён. Гэтыя старажытнарускія бронзавыя або медныя крыжыкі-складні былі добра вядомы як на тэрыторыі зямель Кіеўскай Русі, так і за яе межамі.

Аналіз знаходак і пахавальнага абраду дазваляе выказаць думку, што курганы каля вёскі Курганне былі насыпаны калісьці радзімічамі, а не іншым племенем.

Даследаванні гэтай цікавай курганнай групы толькі пачаліся. Ёсць усе падставы спадзявацца, што яны дапамогуць прачытаць яшчэ адну старонку старажытнай гісторыі нашай Радзімы.

Ул. БАГАМОЛЬНІКАЎ,
студэнт 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

# КОНКУРС МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

ЦК ЛКСМБ аб'явіў аб правядзенні 2-га Рэспубліканскага конкурса работ маладых вучоных па грамадскіх навуках. Да ўдзелу ў ім дапускаюцца маладыя навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, асістэнты, аспіранты, стажоры-даследчыкі, аўтары выдадзеных кніг, брашур, артыкулаў, нарысаў, вучэбна-метадычнай літаратуры, а таксама рукапісаў па марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму камунізму, палітычнай эканоміі, канкрэтнай эканоміцы, гісторыі КПСС, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху, праву, псіхалогіі, педагогіцы і праблемах камуністычнага выхавання моладзі. Узрост аўтара на 1 красавіка 1974 года не павінен перавышаць 33 гады.

Вылучаемыя на конкурс работы павінны ўяўляць сабой самастойна выкананае даследаванне па актульных праблемах грамадскіх навук, вызначаных Пастановай ЦК КПСС ад 14 жніўня 1967 года «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве», дакументамі XXIV з'езда КПСС.

Вылучэнне, адзнака і адбор лепшых работ праводзіцца па адпаведных навуках і праблематыцы асобна для:

а) кніг і манаграфій аб'ёмам звыш 3-х друкаваных аркушаў;

б) артыкулаў і брашур да 3-х друкаваных аркушаў;

в) вучэбна-метадычнай і навукова-папулярнай літаратуры (незалежна ад аб'ёму).

Конкурс праводзіцца ў два туры.

**Першы тур** праводзіцца ў абласцях. Права вылучэння работ на конкурс прадастаўляецца Вучоным саветам, лабараторыям, аддзелам, сектарам, кафедрам грамадскіх навук, камітэтам камсамола, саветам маладых вучоных.

Першы тур конкурса заканчваецца ў студзені—лютым 1974 года ў форме абласных нарад маладых навуковых работнікаў і выкладчыкаў па грамадскіх навуках, дзе падводзяцца вынікі 1-га тура, праводзіцца ўзнагароджанне пераможцаў і выносяцца рэкамендацыі аб удзельніках 2-га тура Рэспубліканскага конкурса.

**Другі тур** праводзіцца ў г. Мінску і завяршаецца рэспубліканскай канферэнцыяй маладых вучоных па грамадскіх навуках у маі 1974 года. Лепшыя работы прадстаўляюцца на 3-ці тур Усесаюзнага конкурса да 1 чэрвеня 1974 года.

# НА СУСВЕТНЫМ ФЕСТЫВАЛІ

**Не так даўно ў Берліне праходзіў X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. У ім удзельнічаў і выпускнік механіка-матэматычнага факультэта нашага ўніверсітэта, Ленінскі стыпендыят Уладзімір Семянчук. Па просьбе рэдакцыі ён дзеліцца сваімі ўражаннямі, якія засталіся ў яго ад гэтага самага шматлікага форуму моладзі ўсіх кантынентаў.**

Кожны дзень, кожная гадзіна, праведзеныя на фестывалі, ва ўсіх яго ўдзельнікаў застануцца ў памяці на ўсё жыццё. ГДР гасцінна прымала пасланцаў больш 140 краін. Адной з самых шматлікіх была дэлегацыя Савецкага Саюза. У яе састаў ўваходзілі маладыя рабочыя, калгаснікі, камсамольскія работнікі, студэнты, спартсмены, артысты.

24 ліпеня дзесяць прыгожа аформленых аўтобусаў адправіліся з Мінска ў Берлін. Дзе б мы не знаходзіліся, дзе б не рабілі прыпынак, нас, паўпрэдаў Краіны Саветаў, усюды сустракалі з выключнай цеплынёй.

На тэрыторыю ГДР мы ўехалі пад вечар. Церусіў дробны дождж. Нечакана за паваротам мы заўважылі вялікую колькасць яркіх агеньчыкаў. Гэта моладзь братняй Германіі з факеламі ў руках ішла вітаць савецкіх пасланцаў. Гралі савецкі і нямецкі аркестры. Твары юнакоў і дзяўчат свяціліся ўсмешкамі. Рабяты спявалі, танцавалі, дарылі кветкі, ажыўлена абменьваліся першымі ўражаннямі. Цяпло сярдэчнай сустрэчы саграваля ўсіх нас у самым шырокім сэнсе слова.

Наша мінская група размясцілася недалёка ад Берліна ў невялікім прыгожым гарадку Людвагефельдзе. Утульныя пакоі з усімі выгодамі, ў двары — плавальны басейн, спартыўныя пляцоўкі, кафэ, бар. Усё гэта прадаставіў нам выдатны нямецкі народ.

Кожны фестывальны дзень пачынаўся для нас з лінейкі, на якой павядамлялася праграма групы на гэты дзень. Мы ўдзельнічалі ў разнастайных цікавых мітынгах і сустрэчах. Асабліва вялікае ўражанне засталося ад ўрачыстага адкрыцця фестываля. Было яснае, сонечнае надвор'е. Калоны дэманстрантаў ішлі праз людскі карыдор. Берлінцы сардэчна віталі пасланцаў усіх краін. Шэсце працягвалася больш трох гадзін. На стадыёне з прамовай да ўдзельнікаў фестывалю звярнуўся Першы сакратар ЦК СЕПГ таварыш Хонекер. У прыватнасці,. ён сказаў: «Моладзь нашай эпохі рашуча змагаецца за трывалы мір ва ўсім свеце, таму што шчасце моладзі магчыма толькі тады, калі ў жыцці народаў існуе мір, бяспека і разрадка напружанасці».

Вельмі прыгожымі былі выступленні спартсменаў ГДР. У неба былі выпушчаны сотні галубоў і шароў з флагамі краін — удзельніц фестывалю.

Затым наступілі фестывальныя будні. Адбылося шмат сустрэч, мітынгаў, спартыўных свят, канцэртаў, гутарак з моладдзю розных краін. Мы сустракаліся з дэлегатамі ГДР, Англіі, Польшчы, Італіі, Афрыкі і многімі іншымі. Усе гэтыя сустрэчы праходзілі ў атмасферы сапраўднай дружбы і ўзаемаразумення. Мы разам спявалі, танцавалі, абменьваліся сувенірамі, аўтографамі, расказвалі пра свае краіны, гарады, у якіх жывем, пра вну, дзе вучымся, і пра многае іншае.

Усе мы былі да глыбіні сэрца крануты мітынгам, які прысвячаўся памяці савецкіх салдат, загінуўшых за вызваленне Еўропы ад гітлераўскага фашызму. Гэты мітынг праходзіў у Трэптаў парку — адным з прыгажэйшых у ГДР. Яго галоўная вартасць — мемарыяльны комплекс памяці савецкіх воінаў.

Ужо сцямнелася, калі мы поплеч з моладдзю Германіі і іншых краін увайшлі на тэрыторыю Трэптаў парка. Нас захапіла тая прыгажосць, якая была на месцы правядзення мітынга. У той жа час гэта прыгажосць была жалобнай. Гучала жалобная музыка, нямецкая моладзь з факеламі ў руках стварала крывава - чырвоны дым. А ў цэнтры стаяў вялікі помнік савецкаму салдату, які з усіх бакоў асвятляўся пражэктарамі. З прамовамі да прысутных звярнуліся Герой Савецкага Саюза А. Марэсьеў і сын анціфашыстаў Ганга і Хельды Коні, якія былі замучаны ў фашысцкіх засценках.

У канцы мітынга ў мёртвай цішыні прагучала клятва. Гэта была клятва аб тым, што моладзь прыкладзе ўсе намаганні да таго, каб не паўтарыліся жахі другой сусветнай вайны.

Берлін вельмі прыгожы. А ў час фестывалю ён ператварыўся ў велізарны музычны цэнтр. Дзесяткі розных аркестраў маршыравалі з канца ў канец па ўсіх вуліцах горада, вітаючы пасланцоў усяго свету. Асабліва прыгожа было ў цэнтры Берліна на Александрплац.

Савецкая дэлегацыя карысталася на фестывалі велізарным поспехам. Дзе б не з'яўляліся нашы юнакі і дзяўчаты, іх усюды абступала моладзь ГДР і іншых краін. Нярэдка нам даводзілася цяжка. Па некалькі гадзін былі вымушаны даваць аўтографы. Рабіць гэта, зразумела, прыемна. Мы адчувалі, якім велізарным аўтарытэтам карыстаецца за мяжой Савецкі Саюз, наш народ.

У дні фестывалю мы імкнуліся як мага больш даведацца пра ГДР, моладзь іншых краін. Мы наведалі Патсдам, Магдэбург, Дрэздэн, азнаёміліся з гістарычнымі славутасцямі гэтых гарадоў.

X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Берліне паслужыў справе далейшага ўмацавання дружбы і ўзаемаразумення паміж маладымі барацьбітамі за мір і прагрэс усіх кантынентаў.

**У. СЕМЯНЧУК.**

ТРЭЦІ, ПРАЦОЎНЫ — ФІНІШАВАЎ

# *Ударна, па-камсамольску*

Аб'ект, на якім працавалі байцы студэнцкага будаўнічага атрада «Сож-73» Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, знаходзіцца амаль у цэнтры горада, дзе будуецца новы мікрараён. Побач з новымі трохпавярховымі дамамі закладзены падмуркі пад будучыя.

— Усё, што вы бачыце перад сабой, зроблена рукамі байцоў атрада «Сож-73», —гаворыць начальнік Нараўлянскай ПМК-122 Аўрам Аскаравіч Гузман. — Студэнтам мы даручылі адну з адказных работ — закладку падмурка і перакрыццё склепа жалезабетоннымі плітамі. Па будаўнічай тэрміналогіі гэта значыць — выйсці да нуля. Байцы атрада бліскуча спраўляюцца з гэтымі нялёгкімі справамі.

Сустрэча гэта адбылася недзе ў сярэдзіне жніўня.

Яшчэ здалёк па аднолькавай форме з нарукаўнымі знакамі можна было пазнаць студэнтаў. Знаёмімся з камандзірам атрада Уладзімірам Раманавым і камісарам Аляксандрам Мазговым. Адразу ж кідаецца ў вочы іх распарадчасць, адчуваецца, што кожны прасякнут пачуццём адказнасці за даручаны ўчастак работы.

— У саставе атрада «Сож-73» — 20 байцоў, — расказвае Уладзімір Раманаў. —Гэта студэнты факультэта фізічнага выхавання, у асноўным, трэцякурснікі. Многія з іх па-сапраўднаму авалодалі будаўнічымі спецыяльнасцямі. Валерый Макарук, напрыклад, дасканала навучыўся падрыхтоўцы бетону, Валянцін Секач, Анатоль Якавец і Леанід Ізотаў — стропальшчыкі, а Рыгор Капітан — муляр.

Не заставаліся без справы студэнты і ў выхадныя дні. Разам з жыхарамі Нароўлі яны выязджалі на нядзельнікі па нарыхтоўцы кармоў у калгас «Кастрычнік». Кіраўнікі калгаса выказалі ім шчырую ўдзячнасць.

Актыўны ўдзел прымалі байцы атрада ў спартыўным жыцці Нароўлі. Многія студэнты маюць разрады па розных відах спорту. Па іх ініцыятыве адбылася таварыская сустрэча паміж футбольнымі камандамі будатрада і зборнай горада Нароўлі. З лікам 2:0 выйгралі студэнты.

На працягу семестра не парываліся ў «сожаўцаў» сувязі і з байцамі будатрада «Амфібія», які працаваў на меліярацыйных трасах раёна ў складзе Нараўлянскай ПМК-20. Сумесна выступілі з канцэртам мастацкай самадзейнасці перад рабочымі ПМК-122.

...Скончылася лета, а разам з ім і працоўны семестр 1973-га. Студэнты поўныя жадання прыехаць працаваў у Нароўлю і будучым летам.

**А. МУЗЫЧЭНКА.**

**У АТРАДЗЕ «ВЕРАСЫ-73»**





**Гэтыя два здымкі былі зроблены фотакарэспандэнтам нашай газеты А. Рудчанкам у атрадзе «Верасы-73» з механіка-матэматычнага факультэта. Яго байцы працавалі на меліярацыі ў Рэчыцкім раёне і паспяхова справіліся з вызначаным аб'ёмам работ. Працаваць было нялёгка. Гэта можна меркаваць і па здымку (справа).**

**Сярод байцоў атрада асаблівай стараннасцю вызначаўся Уладзімір Палавінка (здымак злева).**

МЫ — БАЙЦЫ ПЯЦІГОДКІ

# ПЕРШАЯ ПЕРАМОГА

Калі ў звычайныя дні нашых аматараў паспаць адарваць ад падушкі з'яўляецца задачай вельмі нялёгкай, то ў дзень закладкі апошняй паласы нават самыя лежабокі змянілі сваёй звычцы і выйшлі на фінішны рывок, узброеныя рыдлёўкамі і думкамі аб пераможным канцы.

Няўжо гэта мы, нічога раней не ўмеючыя рабіць на будоўлі, акрамя як добра паесці, змаглі за тры тыдні пабудаваць такую вялізную бетонную пляцоўку, тэрміны ўвядзення ў строй якой выклікалі лёгкае здзіўленне нават у мясцовых рабочых? Няўжо гэта мы, ведаўшыя толькі, ды і то па шпаргалках, асновы матаналізу, так хутка засвоілі будаўнічыя прафесіі? Няўжо гэта мы, бяспечныя дзеці цывілізацыі, так палюбілі суровы быт непаўторных вагончыкаў і прыгажосць вясковага пейзажу?

Так, гэта мы — байцы студэнцкага будаўнічага атрада са сваімі недахопамі і вартасцямі, утвараючыя ў агульнасці адно цэлае — «БРЫГАНЦІНУ».

І няхай загарэлыя рукі некаторых з нас пакрыліся непрывыклымі бугаркамі, няхай не змываецца фарба на пальцах і выступаюць слёзы на вачах ад едкага пылу.

І няхай смяюцца над намі тыя, хто застаўся дома, у ляноце праводзячы свой адпачынак. Мы з імі нават не станем спрачацца. Бо яны ніколі не адведаюць радасці першай перамогі.

Цяпер, калі засталіся ззаду і рэкордныя 120 замесаў на адной бетонамяшалцы за змену брыгадай І. Штыха, і гадзіны цягучага чакання машыны з цэментам, якая, як на зло, тут не з'яўлялася, і 35 кубоў бетону, ўкладзенага за дзень байцамі Шаўлоўскім, Варанцовай, Грузоўскай, Салаўёвым, Лук'яненка, Кавалёвым, і яшчэ многае іншае, аб чым мы будзем успамінаць цэлы год, да новага працоўнага семестра.

Вось, нарэшце, знікла пад тоўстым пластам бетону закупораная ў бутэльку «пасланне да нашчадкаў», якое расказвае аб нашым беспакойным студэнцкім жыцці і, магчыма, праз шмат год праспяваюць яны, як спявалі мы, нашу атрадную песню.

**А. ЛАЙХТМАН,**
**камсорг атрада «Брыганціна-73».**
Буда-Кашалёўскі раён.

## ФАТАГРАФУЕ А. КАСАЛАПАЎ





Студэнт чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандр Касалапаў — вялікі аматар фатаграфіі. Гэтай справай ён захапляецца на працягу многіх гадоў і ўжо дасягнуў пэўных поспехаў. Аляксандру ўласціва тонкае чуццё моманту, ён імкнецца адлюстраваць у сваіх работах усё тое, чым прыгожа наша рэчаіснасць.

А. Касалапаў у мінулым годзе ўдзельнічаў у фотаконкурсе, які праводзіўся нашай газетай, і быў адзначан у ліку лепшых аўтараў.

Сёння мы змяшчаем два новыя фотаздымкі Аляксандра — «Шахматны турнір» і «Аксана».

## НА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

Для павышэння ўзроўню агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі паступаючай у вну моладзі існуе сетка вячэрніх і вочна-завочных курсаў. Іх мэта — дапамагчы рабочым, калгаснікам, звольненым у запас з радоў Савецкай Арміі воінам і іншай моладзі паўтарыць, замацаваць і папоўніць свае веды па прадметах, якія выносяцца на ўступныя экзамены.

У мінулым навучальным годзе на падрыхтоўчых курсах нашага ўніверсітэта ў агульнай колькасці навучалася 1100 чалавек.

У 1973—1974 навучальным годзе ва ўніверсітэце арганізуюцца дзевяцімесячныя вочна-завочныя курсы па падрыхтоўцы да паступлення на гісторыка-філалагічны, фізічны, механіка-матэматычны, біёлага-глебавы, геалагічны і эканамічны факультэты. На курсы прымаюцца асобы з сярэдняй адукацыяй.

Заява аб прыёме на курсы падаецца на імя рэктара ўніверсітэта: на вячэрнія — з 15 па 25 верасня, на вочна-завочныя — з 1 па 20 кастрычніка. Заняткі пачынаюцца на вячэрніх 9-месячных курсах 3 кастрычніка, на вочна-завочных — 1 лістапада.

Навучанне на курсах платнае: на вячэрніх — 20 руб., на вочна-завочных — 15 руб. за ўвесь тэрмін навучання.

**М. ВАЙТКЕВІЧ,**
**загадчык падрыхтоўчых курсаў універсітэта.**

ВАЧЫМА СУДДЗІ

# САМАЯ МАСАВАЯ

Па ініцыятыве прагрэсіўных студэнцкіх арганізацый, пачынаючы з 1959 года, рэгулярна праводзяцца Сусветныя студэнцкія гульні — Універсіяды. З кожным разам яны набываюць усё большую папулярнасць, павялічваецца колькасць краін і спартсменаў, якія выказваюць жаданне ўдзельнічаць у гэтых спаборніцтвах. Так, на Універсіядзе-70 у Турыне ўдзельнічала каля трох тысяч спартсменаў з 58 краін усіх кантынентаў. А сёлета Сусветныя студэнцкія гульні былі яшчэ больш масавымі.

15 жніўня на вялікай спартыўнай арэне Цэнтральнага стадыёна імя У. І. Леніна адбылося адкрыццё Універсіяды-73. У 19 гадзін пад гукі фанфар на поле па-святочнаму ўпрыгожанага стадыёна выйшла 800 гімнастаў з флагамі Універсіяды, сцягамі краін-ўдзельніц і разнакаляровымі вымпеламі. Пачаўся маляўнічы парад усіх каманд, агляд мацнейшых спартсменаў-студэнтаў, прадстаўнікоў 70 краін свету. Усім дэлегацыям студэнткі прыпаднеслі хлеб-соль. Лепшыя спартсмены вынеслі і ўзнялі флаг Універсіяды. Людміла Жаслакова-Жаркова запаліла агонь Сусветных студэнцкіх гульняў, які не пагасаў да 25 жніўня.

Спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы праходзілі з 16 па 20 жніўня па правілах Міжнароднай аматарскай федэрацыі на вялікай спартыўнай арэне Цэнтральнага стадыёна імя У. І. Леніна. Гэтыя грандыёзныя па свайму маштабу спаборніцтвы абслугоўвала 307 высокакваліфікаваных суддзяў. Яны з гонарам справіліся са сваімі абавязкамі. У арсенале суддзяў было шмат электронна-вылічальнай тэхнікі, якая ў СССР прымянялася ўпершыню. Дакладна працавала служба прэс-цэнтра. Па прыбыццю дамоў на семінарах суддзі Універсіяды-73 павінны расказаць сваім калегам аб яе арганізацыі і правядзенні, падзяліцца вопытам работы.

Лёгкаатлеты СССР дабіліся на студэнцкіх гульнях вялікага поспеху. Яны заваявалі найбольшую колькасць залатых, сярэбраных і бронзавых медалёў, а разам з гэтым і ўсеагульную павагу зарубежных сапернікаў.

Універсіяда-73 праходзіла ў атмасферы дружбы і ўзаемаразумення. Па выказваннях яе шматлікіх гасцей, Масква ўжо цяпер гатова да правядзення Алімпійскіх гульняў 1980 года.

**М. ТАЛСТАПЯТАЎ,**
**загадчык кафедры лёгкай атлетыкі, суддзя Ўсесаюзнай катэгорыі, заслужаны трэнер БССР, суддзя Універсіяды-73.**

## НА ПАСЯДЖЭННІ АБ'ЯДНАННЯ

Праведзена пасяджэнне гарадскога метадычнага абъяднання настаўнікаў-фізікаў. Перад педагогамі выступілі кандыдаты фізіка-матэматычных навук з Аб'яднанага Інстытута ядзерных даследаванняў г. Дубна т. Сісакян і Інстытута фізікі высокіх энергій з г. Серпухова т. Сакалоў, а таксама выкладчыкі нашага ўніверсітэта тт. Твардоўскі, Катасонаў і іншыя.

## З НАВУКОВАГА ПОГЛЯДУ

Кожны разумны па-свойму, адзін з пачатку, а другі потым.

Нічога не браў на сваю адказнасць. Кажучы, што зямля круціцца, прыбаўляў:

— Па словах Каперніка.

Студэнт, закончыўшы курс навук, разітваўся з прафесарам, шчыра дзякуючы за ўсё добрае, а потым дадаў:

— Вам я абавязаны ўсім, што ведаю.

— Прабачце, — адказваў прафесар таксама ветліва, — ці варта дзякаваць за такую дробязь!

**Прафесар.** Які народ з гісторыі вам падабаецца найбольш?

**Студэнт** Фінікяне.

**Прафесар.** Чаму?

**Студэнт.** Таму, што там пра іх менш гаворыцца.

Вучоны ведае, што такое невуч, бо сам калісьці ім быў, але невуч не разумее стану вучонага таму, што ніколі ім не быў.

Ёсць тры віды невуцтва: не ведаць нічога, ведаць дрэнна тое, што ведаюць іншыя, і ведаць не тое, што трэба б было ведаць.

Часта дах над галавою не дае людзям расці.

## *ПЕРАМОГА МНАГАБОРЦАЎ*

У апошні час усё больш прыхільнікаў заваёўвае ваенна-прыкладное мнагабор'е. Спартсмены-мнагаборцы, акрамя добрай фізічнай падрыхтоўкі, атрымліваюць трывалыя веды ў тэхніцы.

Вельмі папулярны гэты від спорту сярод студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У трэнераў тут ёсць магчымасць адабраць найбольш здольных спартсменаў для зборнай каманды. І зборная ўніверсітэта з поспехам выступае ў розных спаборніцтвах.

Чарговая перамога прыйшла на нядаўнім абласным першынстве. Мнагаборцы з дзесяці каманд памераліся сіламі ў фігурным ваджэнні матацыкла і аўтамабіля, плаванні, стральбе, кросе, кіданні гранаты.

У асабовым заліку перамогу сярод мужчын атрымаў студэнт ГДУ У. Касабукін (225 ачкоў).

Студэнт ГДУ А. Кузьменка заняў трэцяе месца сярод юнакоў — 143 ачкі.

У выніку трохдзённай барацьбы кубак абласнога камітэта ДТСААФ за агульнакамандную перамогу заваявалі спартсмены ўніверсітэта. Прайграўшы толькі ў ваджэнні матацыкла і аўтамабіля, яны ва ўсіх астатніх відах праграмы дасягнулі выдатных вынікаў.



ВЕРАСЕНЬ ХМУРЫЦЦА. Фотаэцюд А. Рудчанкі.

# ГІСТОРЫКІ ЖАРТУЮЦЬ

Я багоў не памятаю па прозвішчу.

Польшча была чацьвертавана на тры няроўныя палавіны.

Грэчаскія мастакі так адлюстроўвалі коней, што сапраўдныя коні іржалі, гледзячы на іх.

Іван IV, рускі цар, празваны за сваю жорсткасць Васільевічам...

Мемуарамі называюцца ўспаміны, якія пішуцца пасля смерці.

У першабытным грамадстве людзі хадзілі стадамі, а потым пачалі асядлоўвацца і будаваць пячоры.

Чычыкаў купляў мёртвыя душы, каб потым прымусіць іх працаваць.

Скажыце, а Цэзар з якога міфа?

# П А Р А Д Ы

**1. Дзяжурнаму**

З сабой на дзяжурства можна ўзяць (дзяўчатам) вязанне або чужыя канспекты, толькі перапісваць іх трэба не вельмі адкрыта.

Сцеражыце дзверы, за якімі чытаюць лекцыю дэкан або асабліва нервовыя выкладчыкі.

**2. Першакурсніку**

Здаць экзамен можна не рыхтуючыся зусім. (Гэтая і падобныя парады даюцца ў індывідуальным парадку, улічваючы, што газету калі-нікалі чытаюць і выкладчыкі).

**3. Старшакурсніку**

Нават калі ты не адкрываў кнігу, усё роўна падымай руку на практычных і семінарскіх занятках. Праз некаторы час выкладчык вырашыць, што ты старанны студэнт і перастане цябе выклікаць.

**У сувязі са знаходжаннем студэнтаў на ўборцы бульбы наступны нумар нашай газеты выйдзе 22 верасня г. г.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 33961 **«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.** Зак. 5102.